Сяргей НОВІКАЎ

# УРОЧЫШЧА БЛАГАЎШЧЫНА — месца масавага знішчэння людзей на тэрыторыі акупаванай Беларусі

*У гады Вялікай Айчыннай вайны наша краіна страціла амаль кожнага трэцяга жыхара. Сотні тысяч людзей загінулі на франтах вайны, сотні тысяч былі закатаваныя і знішчаныя ў нацысцкіх лагерах. Найбуйнейшым месцам знішчэння людзей на акупаванай тэрыторыі СССР з'яўляўся Трасцянецкі лагер смерці*. На жаль, і сёння немагчыма вызначыць дакладныя маштабы знішчэння людзей у Трасцянцы. У дакументах і гістарыяграфіі прыводзяцца вельмі розныя лічбы, прыкладам чаму з'яўляецца ўрочышча Благаўшчына.*

У гэтым годзе спаўняецца 70 гадоў з таго моманту, калі ва ўрочышчы Благаўшчына (каля вёскі Вялікі Трасцянец) з 27 кастрычніка да 15 снежня 1943 г. былі ліквідаваны сляды масавых злачынстваў, звязаных са знішчэннем да таго часу дзясяткаў тысяч грамадзян БССР, удзельнікаў партызанскай і падпольнай барацьбы, савецкіх ваеннапалонных, дэпартаваных яўрэяў з краін Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. На жаль, само гэта ўрочышча, дзе ў гады вайны адбывалася масавае знішчэнне людзей, да пачатку 2000-х гг. заставалася без ушанавання**. У той жа час на помніку ахвярам фашызму, адкрытым у 1963 г. побач з вёскай Вялікі Трасцянец, была ўсталявана мемарыяльная дошка, на якой змешчаны наступны надпіс: *"Тут, у раёне вёскі Трасцянец, нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі, закатавалі, спалілі 201 500 чалавек, мірных грамадзян, партызан, ваеннапалонных Савецкай Арміі 1941—1944 гг."*. На мемарыяльным знаку ў дзяржаўным мемарыяльным комплексе "Хатынь", адкрытым у 1969 г., значылася ўжо іншая колькасць ахвяр у Трасцянцы — 206,5 тыс. чалавек.

* Назвы "Трасцянецкі лагер смерці" і "Трасцянец" абагулена ўжываюцца ў дачыненні да некалькіх месцаў масавага знішчэння людзей у раёне вёсак Вялікі і Малы Трасцянец, а менавіта: урочышча Благаўшчына — месца масавых расстрэлаў з восені 1941 г. да канца 1943 г.; урочышча Шашкоўка — месца масавага спальвання людзей з восені 1943 г. да прыходу Чырвонай арміі; працоўны лагер побач з вёскай Малы Трасцянец і ўрочышчам Шашкоўка (з вясны 1942 г. да пачатку лета 1944 г.); былы калгасны хлеў на краі вёскі — месца масавага знішчэння людзей у канцы чэрвеня 1944 г.

** У 1963 г. каля в. Вялікі Трасцянец быў пастаўлены помнік ахвярам фашызму, у 1965 г. быў узведзены абеліск на месцы хлява, у якім былі спалены апошнія ахвяры з працоўнага лагера, мінскіх турмаў і лагера на вуліцы Шырокай; у 1966 г. — абеліск загінуўшым ва ўрочышчы Шашкоўка. 27 чэрвеня 1994 г. Савет міністраў Рэспублікі Беларусь прыняў пастанову № 473 "Аб стварэнні мемарыяльнага комплексу "Трасцянец", згодна з якой у пачатку 2000-х гг. быў пастаўлены помнік на месцы масавага знішчэння людзей ва ўрочышчы Благаўшчына.



***НОВІКАЎ Сяргей Яўгеньевіч.***
*Загадчык кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1954 г. у в. Радзіца Крупскага раёна Мінскай вобласці, у 1980 г. закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М.Горкага. Займаецца даследаваннем эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі, праблем германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны і крыніцазнаўства. Аўтар манаграфій "Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў" (Мн., 2002), "Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны" (Мн., 2004), больш за 270 навуковых публікацый. З'яўляецца сарэдактарам навуковых зборнікаў "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць" (Вып. 1—11, Мн., 2002—2013).*

У 2002 г. на месцы масавых расстрэлаў ва ўрочышчы Благаўшчына быў пастаўлены помнік, якім упершыню ўшаноўвалася памяць больш за 150 тыс. савецкіх ваеннапалонных, мінскіх падпольшчыкаў і партызан рэспублікі, грамадзян з розных куткоў Беларусі, яўрэяў з мінскага гета і многіх краін Еўропы. У цяперашні час у гэтым урочышчы і каля в. Малы Трасцянец актыўна вядуцца работы па стварэнні велічнага мемарыялу Памяці. Стварэнне мемарыялу будзе спрыяць захаванню памяці аб дзясятках і сотнях тысяч людзей, якія загінулі на тэрыторыі лагера смерці Трасцянец. Гэта асабліва важна ў мэтах увекавечання памяці ўсіх ахвяр нацысцкага генацыду ў Беларусі. У той жа час пакуль застаецца адкрытым пытанне аб агульнай колькасці ахвяр на месцы знішчэння ва ўрочышчы Благаўшчына. Адной з прычын узнікнення такога пытання нам бачыцца той факт, што ў беларускай гістарычнай навуцы да гэтага часу адсутнічае спецыяльнае навуковае даследаванне, якое б дазваляла стварыць гістарычную карціну тых трагічных падзей на аснове выкарыстання максімальна поўнай базы дакументальных крыніц з беларускіх, расійскіх і нямецкіх архіваў, а таксама новых звестак з айчыннай і замежнай гістарыяграфіі.

Заўважым, што даследчыкам неабходна не толькі ставіць новыя пытанні адносна асобных аспектаў гісторыі кожнага з месцаў масавага генацыду ў раёне Трасцянца, але і зноў звярнуцца да дакументальных матэрыялаў, каб выявіць ступень іх навуковай верагоднасці. Пры гэтым нельга не ўлічваць і той факт, што на цяперашні час пад назвай "Трасцянецкі лагер смерці" абагульнены некалькі месцаў вынішчэння людзей. Гэта асабліва важна ў кантэксце таго, што на месцы былога лагера смерці ў Трасцянцы ствараецца мемарыял Памяці агульнаеўрапейскага маштабу.

Нагадаем асноўныя палажэнні, замацаваныя ў айчыннай літаратуры адносна Трасцянецкага лагера смерці. Ён быў створаны ў лістападзе 1941 г. на 11 км шашы Мінск—Магілёў каля вёскі Малы Трасцянец Мінскага раёна для масавага знішчэння савецкіх грамадзян і ваеннапалонных, палітычных вязняў з еўрапейскіх турмаў і лагераў Аўстрыі, Германіі, Польшчы, Францыі і Чэхаславакіі. Масавыя расстрэлы праводзіліся ва ўрочышчы Благаўшчына (да кастрычніка 1943 г. знішчана 150 тыс. чалавек), затым ва ўрочышчы Шашкоўка (знішчана больш за 50 тыс. чалавек), дзе была створана спецыяльная яма-печ. Дастаўленыя ў канцы чэрвеня 1944 г. вязні з мінскіх турмаў і лагераў былі спаленыя ў калгасным хляве в. Малы Трасцянец і на штабелі дроў побач з ім (6,5 тыс. чалавек). Такім чынам, усяго ў Трасцянецкім лагеры смерці было знішчана 206,5 тыс. чалавек[1]. Па колькасці ахвяр лагер знаходзіцца на 4-м месцы пасля Асвенцыма, Майданека і Трэблінкі. Такія звесткі былі прыведзены ў 1990 г. доктарам гістарычных навук В.Раманоўскім у энцыклапедыі "Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945". На момант жа абароны даследчыкам у 1974 г. доктарскай дысертацыі на тэму "Нямецка-фашысцкая акупацыйная палітыка і яе крах у Беларусі (1941—1944 гг.)" (якая засталася неапублікаванай) канкрэтная агульная лічба колькасці ахвяр на кожным з месцаў масавага знішчэння ў Трасцянцы была невядомай[2].

У другой палове 1980-х гг. выйшла з друку навукова-папулярнае выданне "Экскурсія ў Трасцянец", аўтарам якога з'яўлялася супрацоўніца Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны А.Ванькевіч[3]. У гэтым выданні таксама прыводзілася лічба ахвяр у 206 500 чалавек, устаноўленая Мінскай абласной камісіяй садзейнічання Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі СССР* (далей — НДзК).

**Такім чынам, базавым палажэннем, замацаваным у беларускай савецкай і захаваным у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі, з'яўляецца палажэнне аб масавым знішчэнні ў Трасцянецкім лагеры смерці савецкіх грамадзян і ваеннапалонных, а таксама замежных грамадзян агульнай колькасцю 206,5 тыс. чалавек.** Цікава заўважыць, што лічбы, уведзеныя ў навуковы дыскурс і змешчаныя на помніку ахвярам фашызму каля в. Вялікі Трасцянец не супадалі.

У 2002 г. у Мінску адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя "Генацыд у Другой сусветнай вайне: праблемы даследавання (у памяць ахвяр Трасцянца)", на якой аўтарам гэтых радкоў была выказана думка, што *"для айчынных гісторыкаў сапраўднае даследаванне гэтай гістарычнай, навуковай і міжнароднай праблемы толькі пачынаецца"*[4]. І сапраўды, літаральна праз год выйшаў з друку падрыхтаваны прафесійнымі гісторыкамі, музейнымі работнікамі і архівістамі зборнік дакументаў і матэрыялаў "Лагерь смерти Тростенец", у які былі ўключаны пераважна неапублікаваныя раней архіўныя дакументы і матэрыялы[5]. Праз яго ў навуковы зварот уводзіліся 117 дакументаў аб месцах масавага знішчэння людзей у наваколлі вёскі Малы Трасцянец пад Мінскам у 1942—1944 г., 107 з якіх публікаваліся ўпершыню (87 — з фондаў Нацыянальнага архіва РБ, 11 — Цэнтральнага архіва КДБ РБ, 4 — Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці, 5 — Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны). 10 дакументаў, як адзначаюць укладальнікі, часткова ці цалкам друкаваліся раней.

Звернем асаблівую ўвагу на тры дакументы, прадстаўленыя ў зборніку. Першы з іх падаецца пад № 65 — "Акт Минской областной комиссии содействия в работе ЧГК СССР о преступлениях гитле-

* Паводле пастановы СНК СССР ад 16 сакавіка 1943 г. "Аб рабоце Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх памагатых і нанесеных імі страт грамадзянам, калгасам, грамадскім арганізацыям, дзяржаўным прадпрыемствам і ўстановам СССР", у БССР была створана Беларуская рэспубліканская камісія і 12 абласных камісій (Бабруйская, Баранавіцкая, Брэсцкая, Віцебская, Гомельская, Гродзенская, Магілёўская, Маладзечанская, Мінская, Палеская, Пінская, Полацкая) садзейнічання ў рабоце НДзК СССР. Беларуская рэспубліканская камісія спыніла сваю дзейнасць у верасні 1945 г.

ровцев в районе деревни Малый Тростенец" ад 25 ліпеня 1944 г.[6]; другі (быў раней апублікаваны*) пад № 67 — "Акт Минской областной комиссии содействия в работе ЧГК СССР о массовом истреблении гражданского населения и военнопленных на территории Минска и его окрестностей в 1941—1944 гг.", ад 13 жніўня 1944 г.[7].

У першым дакуменце, падпісаным членамі камісіі на чале з Героем Савецкага Саюза генерал-маёрам В.Казловым, канстатуецца, што *"по самым минимальным подсчетам, в районе лагеря Тростенец фашистскими людоедами уничтожено 546 тысяч человек, из них в 34 могилах захоронены остатки (пепел и кости) 476 тысяч человек, в печи* (Шашкоўка. — **С.Н.**) *сожжено 68 тысяч человек, в сараях и на бревнах сожжено 2000 человек"*[8]. У другім дакуменце, складзеным праз два тыдні і падпісаным камісіяй на чале з акадэмікам медыцынскіх навук АН СССР генерал-палкоўнікам медыцынскай службы Н.Бурдэнкам і В.Казловым, прыведзены ўжо наступныя звесткі: *"Урочище Благовщина являлось местом массовых расстрелов мирных советских граждан с первых дней оккупации до дней прихода Красной Армии... Всего в урочище Благовщина истреблено до 150 тысяч человек... В сарае и на штабеле бревен в д. М.Тростенец было сожжено около 6,5 тысяч человек"*[9]. Як бачна, у другім дакуменце не прыводзяцца даныя адносна колькасці ахвяр ва ўрочышчы Шашкоўка, дзе восенню 1943 г. акупанты пабудавалі спецыяльную печ-яму для крэмацыі трупаў расстраляных і задушаных вокісам вугляроду ў "душагубках" людзей[10]. Не прыведзена ў гэтым дакуменце і агульная лічба ахвяр, знішчаных у раёне Трасцянца.

Сярод упершыню апублікаваных у зборніку дакументаў асаблівую ўвагу заслугоўвае трэці дакумент пад № 68 — "Из справки начальника отдела Белорусской республиканской комиссии содействия в работе ЧГК СССР Г.Л.Логинова** о массовом истреблении гражданского населения в окрестностях Минска в 1941—1944 гг." ад 25 жніўня 1944 г.[11]. У гэтай у поўным сэнсе слова гістарычнай даведцы, якая ў наступным стала асновай савецкай гістарыяграфіі, канчаткова вызначаліся маштабы масавага вынішчэння людзей у раёне вёсак Вялікі і Малы Трасцянец. Таму прывядзем поўны тэкст гэтага дакумента:

*"г. Минск, 25 августа 1944 г.*

*Большой Тростенец, лес Благовщина* (падкрэслена ў дакуменце. — **С.Н.**). *Обнаружено 34 ямы-могилы.*

*1. Длина ямы 35 м, шир[ина] 5 м, гл[убина] 3 м. В среднем в каждой яме похоронено 3675 чел.*

*Люди, привезенные из Германии, Чехословакии, Австрии и других государств.*

*В 34 ямах-могилах похоронено 150 000 человек.*

*Малый Тростенец, лагерь.*

*1. Обнаружен колхозный сарай, сожженный с людьми, в количестве 6500 человек. По подсчету и медицинскому определению.*

*Вблизи деревни Малый Тростенец обнаружена печь-крематорий.*

*По показаниям свидетелей, сожжено советских граждан с 1943 г. до прихода Красной Армии 50 000 человек"*[12].

Калі падлічыць агульную колькасць ахвяр паводле прыведзеных у даведцы даных, то атрымаецца лічба ў 206,5 тыс. чалавек. Звернем, аднак, увагу на некалькі важных момантаў, якія вынікаюць са звестак дакумента. Так, паводле падлікаў следчага, ва ўрочышчы Благаўшчына ў 34 ямах-магілах было знішчана 150 тыс.чалавек. Аднак калі памножыць сярэднюю колькасць пахаваных у кожнай магіле (3675) на 34 магілы, то атрымаецца іншая лічба, роўная 124 950 чалавекам.

Звернем увагу і яшчэ на адну акалічнасць. Так, у першым пункце дакумента, дзе вызначаецца даўжыня, шырыня і глыбіня кожнай ямы-магілы, па незразумелых прычынах адсутнічае запіс аб сярэдняй колькасці пахаваных у адным кубаметры, які ёсць у арыгінале дакумента. І гэта прытым што ўкладальнікі зборніка, па іх словах, прывялі "подлинник справки"[13]. У арыгінале ж першага пункта пад нумарам 4 ёсць яшчэ наступны запіс: *"4. В среднем 7 человек на кубометр"*[14]. Такім чынам, у дакуменце была прыведзена яшчэ сярэдняя лічба, якой карысталіся пры падліках у ходзе правядзення расследавання.

Маючы на ўвазе публікацыю дакументаў, можна казаць пра тое, што беларускімі гісторыкамі і архівістамі была праведзена важная работа па выяўленні новых матэрыялаў, а таксама паглыбленні на іх аснове ведаў па асобных аспектах трагічных падзей на тэрыторыі Трасцянецкага лагера смерці. Перш за ўсё гэта тычыцца ўстанаўлення маштабаў генацыду мясцовага насельніцтва і Халакосту на тэрыторыі Беларусі яўрэяў з Аўстрыі, Германіі і Чэхаславакіі. Заўважым, аднак, што, нягледзячы на даступнасць новых дакументаў і значнае пашырэнне базы крыніц, у гістарычнай літаратуры і грамадскай думцы і сёння захоўваюцца канцэптуальныя палажэнні савецкай гістарыяграфічнай традыцыі. Беларускімі гісторыкамі пакуль не праведзена комплекснае даследаванне гісторыі лагера смерці Трасцянец на аснове максімальна поўнага выкарыстання айчынных і замежных (перш за ўсё нямецкіх) дакументальных і

* Апублікаваны ў кнізе: Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941—1944. Мн., 1965. С. 222—227.

** На момант правядзення работ па расследаванні старшы лейтэнант Логінаў меў толькі сярэднюю адукацыю. Член КПСС з 1928 г., да вайны ён працаваў загадчыкам аддзела кадраў Белкаапрамсавета, у час вайны служыў у органах НКУС БССР, у 1944—1945 гг. — следчым. З 20 ліпеня 1944 г. быў у складзе Мінскай абласной камісіі садзейнічання НДзК СССР, праводзіў работы па забеспячэнні раскопак магіл ахвяр нямецка-фашысцкіх злачынстваў у Мінску. З 28 жніўня — начальнік аддзела расследаванняў і ўліку злачынстваў (здзейсненых нямецка-фашысцкімі захопнікамі) па Беларускай ССР.

гістарыяграфічных матэрыялаў, іх крытычнага супастаўлення і аб'ектыўнага аналізу*.

Своеасаблівае бачанне "месца знішчэння з міжнароднымі функцыямі" прапанавала беларуская даследчыца Т.Вяршыцкая. У спецыяльным артыкуле, падрыхтаваным для фундаментальнай энцыклапедыі "Холокост на территории СССР", яна ўнесла пэўныя ўдакладненні ў традыцыйнае бачанне гісторыі Трасцянецкага лагера смерці. Першым з іх з'яўляецца, на наш погляд, важнае ўдакладненне адносна хранагічных рамак існавання лагера як месца знішчэння. Так, яго стварэнне Т.Вяршыцкая адлічвае не з восені 1941 г., як гэта падае В.Раманоўскі, а з мая 1942 г., калі ў раёне Трасцянца быў практычна цалкам знішчаны транспарт з еўрапейскімі яўрэямі. Да канца вайны два ўрочышчы — Благаўшчына і Шашкоўка — з'яўляліся месцамі *"систематического уничтожения гражданского населения, в том числе белорусских евреев, пленных из Минска и окрестностей, а также заключенных и евреев из стран Западной Европы — Австрии, Германии, Польши, Румынии, Чехословакии, Франции"*[15]. Гаворачы пра маштабы людской трагедыі, Т.Вяршыцкая звяртае ўвагу на факт існавання некалькіх лічбаў агульнай колькасці ахвяр, знішчаных у Трасцянцы: 201,5 тыс., 206,5 тыс., 250 тыс., 546 тыс. чалавек. Даследчыца згодная з нямецкім гісторыкам К.Герлахам у тым, што ўстанавіць дакладныя даныя аб колькасці ахвяр немагчыма, паколькі з кастрычніка 1943 г. зондэркаманда 1005** праводзіла эксгумацыю трупаў з магіл масавага пахавання ва ўрочышчы Благаўшчына і потым спальвала іх. Паводле даных НДзК, прыведзеных у артыкуле Т.Вяршыцкай, усяго ў 34 ямах было пахавана 150 тыс. чалавек. Пры гэтым сама аўтар адзначае, што, адпаведна звестак з працы нямецкага гісторыка К.Герлаха, гэта лічба складала ад 40 да 50 тыс. чалавек. Заўважым, аднак, што нямецкі даследчык прыводзіць гэтую лічбу з наступнай агаворкай — "па грубых падліках"[16].

Новым словам у сучаснай гістарыяграфіі неабходна лічыць даследаванне нямецкага гісторыка П.Рэнтрап "Месцы злачынстваў "канчатковага пытання". Мінскае гета і месца знішчэння Малы Трасцянец", якое выйшла ў канцы 2011 г. Рэцэнзія на гэтае выданне ўжо друкавалася на старонках "Беларускага гістарычнага часопіса"[17].

У сваім даследаванні П.Рэнтрап не выкарыстоўвае абагульненую назву Трасцянец, а ўжывае наступныя назвы з дакументаў: працоўны лагер Малы Трасцянец, месцы масавага знішчэння ў раёне Малога Трасцянца — Благаўшчына, Шашкоўка, хлеў. Даследчыца ставіць пад сумненне факт правядзення ў Благаўшчыне расстрэлаў неяўрэйскага насельніцтва і савецкіх ваеннапалонных, пачынаючы ўжо з восені 1941 г. Спасылаючыся на дакументы, яна паказвае, што працоўны лагер быў створаны на ўскраіне вёскі Малы Трасцянец (на тэрыторыі былога калгаса імя Карла Маркса) у канцы красавіка 1942 г. Падчас першага расстрэлу ў Благаўшчыне, які адбыўся 11 мая, былі знішчаны каля 1 тыс. яўрэяў з Вены (Аўстрыя). Новай нам бачыцца думка даследчыцы пра тое, што аднаўленне дэпартацыі еўрапейскіх яўрэяў у напрамку Мінска з'яўлялася вызначальнай умовай для стварэння месца знішчэння ў Благаўшчыне. На працягу перыяду з мая па кастрычнік 1942 г. у Мінск і Малы Трасцянец (праз станцыю Калодзішчы. — **С.Н.**) прыбылі 16 эшалонаў з дэпартаванымі яўрэямі, з якіх: 9 — з Вены, 5 — з Тэрэзіенштата, і па адным з Кёнігсберга і Кёльна[18]. З амаль 23 тыс. дэпартаваных у Мінск і Малы Трасцянец яўрэяў у жывых засталіся толькі 75 чалавек. Агульная колькасць людзей, знішчаных у раёне Малога Трасцянца, складае значна менш за 60 тыс., з якіх у Благаўшчыне было забіта больш за 30 тыс. яўрэяў[19]. Пры гэтым П.Рэнтрап адзначае, што нямецкі даследчык К.Герлах бяздоказна прымае афіцыйную лічбу ў 6500 ахвяр, знішчаных у хляве на краі вёскі. Па перакананні Рэнтрап, гэтая лічба павінна быць меншай. Праўда, яна адзначае, што дакладныя даныя атрымаць немагчыма[20].

Звернем увагу чытача на тое, што базай для высноў П.Рэнтрап з'яўляюцца матэрыялы судовых працэсаў над нацысцкімі злачынцамі ў пасляваеннай Германіі. Па пытанні знішчэння ахвяр у Благаўшчыне даследчыца звяртаецца да матэрыялаў следства над Адольфам Рубэ, былым кіраўніком рабочай групы (у склад якой уваходзілі 3—4 перакладчыкі), накіраваным ад мінскай паліцыі бяспекі і СД у склад каманды 1005. Па словах А.Рубэ, яго функцыянальныя абавязкі заключаліся ў тым, каб разам з савецкімі ваеннапалоннымі ўскрыць ямы, дастаць адтуль рэшткі трупаў, раскласці іх у некалькі ярусаў і падпаліць. У хуткім часе, як паказваў на допыце Рубэ, *"рускія перакладчыкі настолькі добра працавалі самі, што мне нічога не заставалася, якназіраць за гэтай работай"*[21]. У сваіх паказаннях А.Рубэ згадваў таксама іншых сведак тых жахлівых падзей, і сярод іх старшага лейтэнанта Ота Гольдапа — афіцэра ведамства мінскай паліцыі бяспекі і СД, які з 27 кастрычніка да 15 снежня 1943 г. (г.зн. на працягу ўсяго тэрміну дзейнасці зондэркаманды 1005 ва ўрочышчы Благаўшчына) выконваў

---

* Спробу напісання і абароны дысертацыйнай працы рабіў С.Тукала. Гл.: Тукала С.М. Генацыд і барацьба яўрэяў Мінскага гета ў гады Вялікай Айчыннай вайны (ліпень 1941 — кастрычнік 1943 года): аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02. Мн., 2008. 23 с.; Тукала С.М. Генацыд і барацьба яўрэяў Мінскага гета ў гады Вялікай Айчыннай вайны (ліпень 1941 — кастрычнік 1943 года): аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02. Мн., 2010. 25 с.

** Зондэркаманда 1005 атрымала свой нумар паводле ўліковай нумарацыі спраў аб эксгумацыі трупаў з магіл, што захоўваліся ў бягучым архіве ў РСХА. У чэрвені 1943 г. гэтая каманда пачала сваю дзейнасць у Львове, дзе займалася ліквідацыяй слядоў злачынстваў у Янаўскім лагеры (са 197 тыс. ахвяр быў другім у СССР пасля Трасцянецкага лагера смерці). У жніўні былі створаны мабільныя зондэркаманды 1005-А і 1005-Б на Украіне, 1005-Mitte — у Беларусі.

абавязкі намесніка камандзіра зондэркаманды*. Аднак паказанні гэтага афіцэра, якія могуць праліць дадатковае святло на агульную лічбу ахвяр ва ўрочышчы Благаўшчына, па незразумелых прычынах не выкарыстоўваць у сваіх даследаваннях ні К.Герлах[22], ні Т.Вяршыцкая[23], ні П.Рэнтрап[24]. Між тым, О.Гольдап называе агульную лічбу ахвяр, рэшткі якіх знішчаліся зондэркамандай 1005 ва ўрочышчы Благаўшчына на працягу 6 тыдняў, пачынаючы з канца кастрычніка і да сярэдзіны снежня 1943 г. Паводле яго ацэнак, зафіксаваных у ходзе судовага працэсу, зондэркаманда 1005 за той час спаліла трупы да 100 тыс. чалавек[25]. Такую ж лічбу ўводзяць у зварот, аднак без спасылак на дакументальныя крыніцы, і ўкладальнікі зборніка "Лагерь смерти Тростенец" (2003), падрыхтаванага пад навуковым кіраўніцтвам вядомага беларускага архівіста Г.Кнацько[26].

Такім чынам, мы маем параўнальна новы факт адносна колькасці ахвяр ва ўрочышчы Благаўшчына. І гэтыя даныя разыходзяцца не толькі з данымі НДзК, але таксама з данымі замежных даследчыкаў, выяўленымі і ўведзенымі ў навуковы зварот выключна на падставе выкарыстання матэрыялаў пасляваенных судовых працэсаў *(гл. табліцу 1)*.

Мы пагаджаемся з тым, што знайсці пераканаўчыя доказы аб дакладнай колькасці знішчаных ва ўрочышчы Благаўшчына людзей аўтару гэтых радкоў і іншым даследчыкам пакуль не ўдалося. Аднак лічба ахвяр, уведзеная ў навуковы зварот нямецкімі даследчыкамі (каля 60 тыс. чалавек), была атрымана толькі на аснове паказанняў нацысцкіх злачынцаў, якія былі зацікаўленыя ў змяншэнні колькасці ахвяр. Па нашым перакананні, размова павінна ісці аб неабходнасці працягу навуковых пошукаў і ўліку новых дакументаў, якія праліваюць любое святло на маштабы людской трагедыі пад Мінскам на працягу 1942—1943 гг. — часу існавання месца знішчэння ва ўрочышчы Благаўшчына. Новыя даныя аб колькасці ахвяр (каля 100 тыс. чалавек) аўтар гэтых радкоў не ўзводзіць у разрад ісціны ў апошняй інстанцыі, але без іх уліку нельга далей весці навуковае даследаванне акрэсленай праблематыкі. Пры гэтым неабходна памятаць, што да гэтага часу ў айчыннай гістарычнай навуцы адсутнічае спецыяльнае даследаванне заяўленай праблемы на аснове ўсіх наяўных на цяперашні час дакументальных крыніц, у тым ліку замежных. Трэба ўлічваць і тыя абставіны, у якіх даводзілася працаваць членам Беларускай рэспубліканскай і Мінскай абласной камісій па садзейнічанні НДзК СССР, калі перад імі ставілася задача правесці работы ў максімальна кароткія тэрміны, каб *"неадкладна вызначыць колькасць знішчаных і спаленых жывымі савецкіх людзей"*[29]. Таму зусім лагічным нам бачыц-

* Камандзірамі зондэркаманды 1005 у Благаўшчыне былі: А.Хардэр (з 27.10 па 10.11.1943 г.), доктар навук Ф.Зеекель (з 11.11 па 8.12.1943 г.) і М.Крахер (з 8.12 па 15.12.1943 г.). Старшы лейтэнант О.Гольдап з'яўляўся намеснікам Хардэра, Зеекеля і Крахера з 27.10 па 15.12.1943 г.

*Табліца 1*

**Зводныя даныя аб колькасці ахвяр у Трасцянецкім лагеры смерці**

| Крыніца звестак | Агульная колькасць ахвяр у Трасцянецкім лагеры смерці | Колькасць ахвяр у месцы масавага знішчэння Благаўшчына |
|---|---|---|
| Акт Мінскай абласной камісіі НДзК (25 ліпеня 1944 г.) | 546 тыс. | 476 тыс. |
| Акт Мінскай абласной камісіі НДзК (13 жніўня 1944 г.) | не прыводзіцца | да 150 тыс. |
| Даведка Логінава Г.Л. (25 жніўня 1944 г.) | 206,5 тыс. | 150 тыс. |
| Преступления немецко-фашистских "захватчиков в Белоруссии" (1965) | не прыводзіцца | да 150 тыс. |
| Дзяржаўны мемарыяльны комплекс "Хатынь" (1969) | 206,5 тыс. | не прыводзіцца |
| Рамаnoўскі В.П. (1974) | 206,5 тыс. | не прыводзіцца |
| Ванькевіч А.Г. (1986) | 206,5 тыс. | 150 тыс. |
| "Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне: энцыклапедыя" (1990) | 206,5 тыс. | 150 тыс. |
| Герлах К. (1999) | каля 60 тыс. | ад 40 да 50 тыс. |
| "Республика Беларусь: энциклопедия" (2008)[27] | 206,5 тыс. | 150 тыс. |
| Рэнтрап П. (2011) | значна менш за 60 тыс. | ад 40 да 50 тыс. |
| Кузняцоў І.М. (2013)[28] | 81 тыс. | 60 тыс. |
| Паказанні О.Гольдапа Зборнік "Лагерь смерти Тростенец" (2003) | не прыводзіцца<br>206,5 тыс. | каля 100 тыс.<br>каля 100 тыс. |



*Помнік на месцы масавых растрэлаў ва ўрочышчы Благаўшчына.* Фота С.Новікава. 2013 г.

ца тое, што падчас працы на месцы масавага знішчэння людзей у Благаўшчыне камісіяй былі закладзены кантрольныя шурфы толькі на 5 (!) з 34 ям-магіл[30].

Такім чынам, відавочна, што даныя адносна агульнай колькасці ахвяр, знішчаных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ва ўрочышчы Благаўшчына (галоўным месцы знішчэння ў Трасцянцы), чакаюць карэкціроўкі. Пры гэтым мы падкрэсліваем, што дакументы НДзК застаюцца для даследчыкаў важнай гістарычнай крыніцай, аднак цяпер ужо не адзінай, як гэта было ў савецкі час. На сёння вядомы цэлы комплекс нямецкіх дакументаў, асабліва матэрыялаў судовых працэсаў, дзе зафіксаваны паказанні відавочцаў адносна месца знішчэння ва ўрочышчы Благаўшчына. Увядзенне ў навуковы зварот новых дакументальных даных дазваляе ўнесці пэўныя карэктывы ў агульнапрынятыя гадамі ўяўленні аб гісторыі Трасцянецкага лагера смерці ўвогуле і аднаго з самых вялікіх месцаў масавага знішчэння людзей — урочышча Благаўшчына — у прыватнасці.

Прапанаваны падыход асабліва важны цяпер, калі на міжнароднай навуковай канферэнцыі "Лагер смерці Трасцянец у еўрапейскай памяці"[31], якая адбылася ў Мінску 21—24 сакавіка 2013 г., шырокай грамадскасці былі прадстаўлены два розныя праекты па ўшанаванні памяці ахвяр нацысцкага генацыду ў раёне Трасцянца. У аснову аднаго з іх, падрыхтаванага галоўным архітэктарам Мінскпраекта, кіраўніком праектнай групы "Трасцянец" Г.Аксёнавай, пакладзена ідэя стварэння адзінага мемарыяльнага ансамбля з цэласнай кампазіцыяй, аснову якой будуць фарміраваць скульптурныя аб'екты з назвамі "Вароты памяці", "Поле пахавання", "Дарога памяці" і "Дарога смерці". Разам з мемарыяльнымі плітамі, размешчанымі каля былых баракаў, забудоў і вытворчых майстэрняў, яны будуць нагадваць наведвальнікам аб трагедыі на тэрыторыі былога працоўнага лагера каля в. Малы Трасцянец. Адразу ж заўважым, што канцэпцыя кампазіцыі пакідае па-за межамі будучага мемарыяльнага ансамблю тры важныя аб'екты: хлеў, дзе былі спаленыя 6,5 тыс. вязняў мінскіх турмаў і лагера на вуліцы Шырокай; бункер, дзе ўтрымлівалі частку гэтых людзей непасрэдна перад расстрэлам у хляве; чыгуначную платформу, да якой былі дастаўленыя амаль два дзясяткі тысяч яўрэяў з Аўстрыі, Германіі і Чэхаславакіі. Без гэтых аб'ектаў кампазіцыя будзе зноў утрымліваць пэўныя белыя плямы.

Аўтарам другога праекта з'яўляецца заслужаны архітэктар Беларусі Л.Левін. У асобным мемарыяле, зробленым у форме "Дарогі смерці", якая з белага паўкруга ў яе пачатку будзе цягнуцца яркай чырвонай стужкай ад Магілёўскай шашы да ям-магіл ва ўрочышчы Благаўшчына і завяршацца пустым чорным кругам, плануецца ўшанаваць памяць забітых яўрэяў Мінскага гета, а таксама дэпартаваных яўрэяў з Германіі і Аўстрыі. Заўважым, што канцэпцыя гэтага помніка пакідае адкрытым пытанне аб увекавечанні памяці савецкіх ваеннапалонных, мінскіх падпольшчыкаў, партызан рэспублікі, грамадзян з розных куткоў Беларусі.

Аўтар гэтых радкоў прапаноўвае зыходзіць з таго бясспрэчнага гістарычнага факта, што ў будучым мемарыяле на тэрыторыі Трасцянецкага лагера смерці неабходна ўшанаваць памяць не толькі яўрэяў з Мінскага гета і краін Цэнтральнай і Заходняй Еўропы, але тысяч беларускіх партызан і падпольшчыкаў, савецкіх ваеннапалонных, грамадзян з розных куткоў Беларусі. Пры гэтым неабходна адмовіцца ад абагульненай назвы "Трасцянецкі лагер смерці", як і ад назваў накшталт "канцлагер"[32], паколькі каля вёсак Малы і Вялікі Трасцянец фактычна існаваў толькі працоўны лагер, а знішчэнне людзей адбывалася ў трох месцах, якія толькі па сваіх функцыях вынішчэння набліжаюцца да лагераў смерці.

Адпаведна агульнапрынятай класіфікацыі, лагеры смерці мелі спецыяльную адміністрацыю, службы,




*Надпіс на помніку ва ўрочышчы Благаўшчына.* Фота С.Новікава. 2013 г.

якія адказвалі за ўтрыманне лагера і знішчэнне людзей, уключалі месцы размяшчэння, аб'екты выкарыстання і месцы знішчэння. У выпадку ж Трасцянца размова ідзе пра працоўны лагер і канкрэтныя месцы знішчэння — ямы-магілы, печ для спальвання, хлеў. На нашу думку, найбольш трапнай будзе абагульненая назва "месца масавага знішчэння Трасцянец".

У заключэнне неабходна адзначыць, што нават усведамленне існуючых вакол Трасцянца праблем можа стаць адным з важных крокаў на шляху па іх паспяховым і правільным рашэнні. Адна з важнейшых высноў аўтарскага даследавання на гэты момант заключаецца ў тым, што выяўлены комплекс дакументальных крыніц ставіць на парадак дня беларускай гістарыяграфіі задачу правядзення спецыяльнага навуковага даследавання па гэтай тэме з улікам дасягненняў навейшай тэорыі і метадалогіі, асабліва вынікаў кампаратыўнага аналізу айчынных і замежных крыніц з мэтай атрымання новых навуковых ведаў.

---

[1] Раманоўскі В.П. Трасцянецкі лагер смерці // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: Энцыклапедыя / Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. Мн., 1990. С. 590.

[2] Романовский В.Ф. Немецко-фашистская оккупационная политика и ее крах в Белоруссии (1941—1944 гг.): дис. ... д-ра истор. наук: 07.00.02. Мн., 1974. Л. 92.

[3] Ванькевич А.Г. Экскурсия в Тростенец. Мн., 1986.

[4] Новікаў С.Я. Трасцянецкі лагер як аб'ект сучаснай германскай гістарыяграфіі // Генацыд у Другой сусветнай вайне: праблемы даследавання (у памяць ахвяр Трасцянца): Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі, 25—27 красавіка 2002 г., Мінск / адк. рэд. К.І.Казак, А.М.Літвін, У.Н.Сідарцоў. Мн., 2003. С. 68.

[5] Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы / Сост. В.И.Адамушко, Г.Д.Кнатько, Н.Е.Калесник, В.Д.Селеменев, Н.А.Яцкевич. Под ред. Г.Д.Кнатько. Мн., 2003.

[6] "Акт Минской областной комиссии содействия в работе ЧГК СССР о преступлениях гитлеровцев в районе деревни Малый Тростенец" от 25 июля 1944 г. // Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы. С. 102—106.

[7] "Акт Минской областной комиссии содействия в работе ЧГК СССР о массовом истреблении гражданского населения и военнопленных на территории Минска и его окрестностей в 1941—1944 гг." от 13 августа 1944 г. // Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы. С. 110—116.

[8] "Акт Минской областной комиссии содействия в работе ЧГК СССР о преступлениях гитлеровцев в районе деревни Малый Тростенец" от 25 июля 1944 г. С. 106.

[9] "Акт Минской областной комиссии содействия в работе ЧГК СССР о массовом истреблении гражданского населения и военнопленных на территории Минска и его окрестностей в 1941—1944 гг." от 13 августа 1944 г. С. 113.

[10] Там жа.

[11] "Из справки начальника отдела Белорусской республиканской комиссии содействия в работе ЧГК СССР Г. Л. Логинова о массовом истреблении гражданского населения в окрестностях Минска в 1941—1944 гг." от 25 августа 1944 гг // Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы. С. 116—117.

[12] Там жа.

[13] Там жа. С. 117.

[14] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НА РБ). Ф. 845, воп. 1, спр. 63, арк. 59.

[15] Вершицкая Т.Г. Тростенец // Холокост на территории СССР: Энциклопедия. М., 2009. С. 987.

[16] Gerlach Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 1999. S. 770.

[17] Новікаў С.Я. Мінскае гета і Малы Трасцянец: новае даследаванне // Беларускі гістарычны часопіс. 2012, № 3. С. 25—34.

[18] Rentrop P. Tatorte der Endlösung. Das Ghetto Minsk und die Vernichtungsstätte von Maly Trostinez. Berlin, 2011. S. 203.

[19] Новікаў С.Я. Мінскае гета і Малы Трасцянец: новае даследаванне. С. 25—34.

[20] Rentrop P. Tatorte der Endlösung. Das Ghetto Minsk und die Vernichtungsstätte von Maly Trostinez. S. 227.

[21] Protokol der Vernehmung Adolf Rübe, Leiter des Arbeitskommandos des Sonderkommandos 1005-Mitte in Blagowschtschina // Kohl P. Das Vernichtungslager Trostenez. Augenzeugen-berichte und Dokumente. Dortmund, 2003. S. 77.

[22] Gerlach Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. S.1210.

[23] Вершицкая Т.Г. Тростенец // Холокост на территории СССР: Энциклопедия. С. 987.

[24] Rentrop P. Tatorte der Endlösung. Das Ghetto Minsk und die Vernichtungsstätte von Maly Trostinez. S. 249— 251.

[25] Центральный архив ФСБ РФ. Дело № К-519289: Протокол допроса арестованного от 28 января 1950 г. Л. 62.

[26] Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы. С. 4.

[27] Тростенецкий лагерь смерти // Республика Беларусь: энциклопедия: В 6 т. Т. 7 / Редкол.: Г.П. Пашков и др. Мн., 2008. С. 268.

[28] Кузнецов И.Н. Тростенец: актуальные проблемы исследований // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 6 крас. 2012 г. Вып. 12. У 2 т. Т. 1 / рэдкал.: А.А.Каваленя (адк. рэд.), С.Я.Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. Мн., 2013. С. 84.

[29] "Информационная записка представителей ЧГК СССР Б.Т.Готцева и В.Ф.Табелева председателю Белорусской республиканской комиссии содействия ЧГК СССР П.К.Пономаренко о необходимости организации мероприятий по расследованию преступлений немецко-фашистских захватчиков в окрестностях деревни Малый Тростенец" от 17 июля 1944 г // Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы. С. 71.

[30] "Протокол осмотра мест уничтожения людей в окрестностях деревни Малый Тростенец" от 14—21 июля 1944 г. // Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы. С. 61.

[31] Канюта В. Трасцянец патрабуе ўвагі // Звязда. 2013, 3 сакавіка. С. 5.

[32] Там жа. С. 5.